УДК 371.335.7

**Г. Ф. Швед**, выкладчык (БДТУ)

# МУЗЕЙНЫЯ ЗАНЯТКІ ЯК АДНА З ФОРМ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

Музей – гэта культурна-асветніцкая ўстанова, якая з'яўляецца важным кампанентам сістэмы адукацыі. У сённяшніх умовах ідзе супрацоўніцтва навучальных устаноў і музеяў. Музей валодае спецыфічнымі, унікальнымі, уласцівымі толькі яму сродкамі ўздзеяння. Музеі, як і ўстановы адукацыі, фарміруюць гарманічную асобу з шырокім культурным кругаглядам. Кафедра беларускай мовы БДТУ актыўна супрацоўнічае з музеямі г. Мінска.

Museum is cultural-educational institution, which is the significant part of educational system. Nowadays cooperation between scientific places and museums is being livened up. Museum has specific, unique, appropriate only for it means of influence. Museums as an educational institution build up harmonic personality and broaden its cultural horizons. Belarusian language department of BSTU is being actively collaborating with Minsk museums.

**Уводзіны.** У розныя часы на першы план выходзілі тыя ці іншыя функцыі музея, у тым ліку адукацыйныя і выхаваўчыя. У XX ст. замацаваўся падыход да музея як да культурна-асветніцкай установы, якая з'яўляецца важным кампанентам сістэмы адукацыі. Музейная дзейнасць спрыяе развіццю навукі, асветы, мастацтва, разуменню прыроды і гістарычнай спадчыны, фарміраванню агульнакультурнага асяроддзя. У абноўленай сістэме музейнай камунікацыі наведвальнік перастае разглядацца як маўклівы аб'ект уздзеяння, а становіцца суб'ектам, раўнапраўным удзельнікам камунікатыўнага працэсу. У новых умовах пачынае актыўна распрацоўвацца і выкарыстоўвацца паняцце «музейная педагогіка». Музеі выходзяць за межы простага асветніцтва, перад імі ўсё больш паўстаюць задачы выяўлення выхаваўчага патэнцыялу музейнай інфармацыі [1].

У сённяшніх умовах ідзе супрацоўніцтва навучальных устаноў і музеяў. Музей становіцца часткай сістэмы бесперапыннай адукацыі. Але паняцце «адукацыя» не абмяжоўваецца толькі навуковымі ведамі. Яно патрабуе больш шырокага тлумачэння, бо ў якасці элементаў культуры, якія ствараюць цэласную карціну свету, выступаюць таксама мастацтва, мараль, палітыка, рэлігія, побыт, звычаі і г. д.

Музей валодае спецыфічнымі, унікальнымі, уласцівымі толькі яму сродкамі ўздзеяння. З іх дапамогай раскрываецца яго культурна-асветніцкі патэнцыял. Музей фарміруе ў чалавека асабістыя, эмацыянальна афарбаваныя адносіны да тых ці іншых фактаў. Не менш за музейны прадмет і музейную экспазіцыю само музейнае асяроддзе выступае істотным сродкам педагагічнага ўплыву на чалавека. У ім ствараецца непаўторная эмацыянальна-эстэтычная атмасфера, якая моцна ўздзейнічае на асобу.

Запатрабаванні часу ўносяць карэктывы ў працу музеяў. Апошнія разам з традыцыйнымі лекцыямі і экскурсіямі сталі выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці наступныя формы – клубы па інтарэсах, музейныя святы, студыі, прэзентацыі. Але трэба адзначыць, што абавязковай умовай эфектыўнасці гэтых форм і захавання музейных функцый з'яўляецца выкарыстанне спецыфічных музейных сродкаў. Прэзентацыі новых выданняў сталі ўжо традыцыйнымі для беларускіх літаратурных музеяў, якія дазваляюць аўтарам сустрэцца з аўдыторыяй, а наведвальнікам – сачыць за падзеямі ў літаратурным жыцці. У клубы па інтарэсах запрашаюцца знакамітыя гісторыкі, літаратары, навукоўцы, абмяркоўваюцца цікавыя для аўдыторыі тэмы. У сувязі з тым, што да ўдзелу ў масавых мерапрыемствах актыўна далучаецца творчая інтэлігенцыя, пашыраецца ўзаемадзеянне музея з іншымі ўстановамі культуры і навукі.

**Асноўная частка.** Кафедрай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта арганізавана наведванне са студэнцкімі групамі наступных музеяў: Дзяржаўны мастацкі музей, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўны літаратурны музей Я. Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Я. Коласа, Літаратурны музей М. Багдановіча, Дзяржаўны музей гісторыі і культуры, Дзяржаўны музей прыроды і экалогіі.

Хацелася б спыніцца на апошнім. На кафедры беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта дзейнічае экалагічны гурток «Крыніца», удзельнікамі якога з'яўляюцца студэнты ЛГФ. Адна з форм работы гуртка – музейныя заняткі ў Дзяржаўным музеі прыроды і экалогіі Рэспублики Беларусь.

Музей заснаваны ў 1991 г. на базе заалагічнай і батанічнай калекцый свайго папярэдніка – Дзяржаўнага музея БССР. Сёння – гэта пастаянная экспазіцыя, размешчаная ў шасці тэматычных залах. Іх агульная плошча – усяго 260 м$^2$. Экскурсаводы расказваюць пра карысныя выкапні Беларусі, сезонныя змены ў прыродзе, пра рэкі, азёры і іх насельнікаў. Дзве залы знаёмяць з лясным багаццем краіны. Пра рэдкія ві-

ды раслін, жывёл і птушак, якія трэба берагчы і ахоўваць, можна даведацца ў зале Чырвонай кнігі. Кожная экскурсія мае гукавое суправаджэнне. Перад наведвальнікам адкрываецца багаты і таямнічы свет лясных гукаў. Тут можна пачуць, як спяваюць птушкі, як завываюць ваўкі і рохкаюць дзікі.

За год музей наведваюць прыкладна 50 тысяч чалавек. Штодзень праходзіць каля 10 экскурсій. Яны разлічаны на людзей рознага ўзросту: школьнікаў, студэнтаў, усіх аматараў прыроды. У музеі вядзецца навуковая работа. З ёй спраўляюцца тры аддзелы. Навукова-асветніцкі праводзіць экскурсіі, у навукова-фондавым захоўваюць музейныя калекцыі, аддзел таксідэрміі робіць чучалы, папаўняе спіс экспанатаў жывой прыроды. Пастаянна пашыраюцца тэмы экскурсій, каб людзі атрымлівалі дастаткова аб'ём экалагічнай інфармацыі.

Вартае асаблівай увагі музейнае багацце. Ёсць самая вялікая ў Беларусі калекцыя птушыных яек (аэлагічная). У арніталагічнай сабраны амаль усе віды птушак, захоўваюцца цікавая энтамалагічная і багатая калекцыя млекакормячых. Іх агульны склад 35 тысяч экземпляраў.

Калектыў музея складаецца з 41 чалавека, з іх 16 – навуковыя супрацоўнікі. Любоў да прыроды і сваёй справы дапамагае калектыву працаваць, папаўняць калекцыі, ствараць навуковую канцэпцыю музея.

У 2009 г. са студэнтамі І курса ЛГФ была праведзена экскурсія ў Бярэзінскі біясферны запаведнік, якая выклікала зацікаўленасць у будучых спецыялістаў. На тэрыторыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка плошчай 85 тыс. га чалавеку дазволена толькі назіраць за працэсамі, якія тут адбываюцца. Умешвацца ў іх забаронена.

Крыху больш за 80 гадоў таму галоўнай вартасцю мясцін, якія сёння называюцца пярлінай прыроднай спадчыны Еўропы, былі…пасяленні баброў. Менавіта дзеля захавання гэтага, рэдкага тады ў Беларусі звярка ў 1925 г. быў заснаваны Бярэзінскі запаведнік, адзін з першых у былым СССР. Праз 15 гадоў бабры не толькі запаланілі Бярэзіну, але і рассяліліся па ўсёй Беларусі. А запаведніку, які выканаў сваю задачу, зноў жа ў ліку першых у Савецкім Саюзе, у 1978 г. прысвоілі статус біясфернага. Тым самым на Бярэзінскі было ўскладзена абавязацельства па захаванні ўсталяванай тут біялагічнай разнастайнасці.

Сімвалам гэтай тэрыторыі стаў буры мядзведзь, адлюстраваны на фоне сасны і зарасніку вярбы ўздоўж берагоў. Багаты раслінны і жывёльны свет запаведніка – не менш прываблівая асаблівасць гэтай тэрыторыі. Аднак для сусветнай супольнасці самы вялікі інтарэс прадстаўляюць, безумоўна, рэдкія віды флоры і фауны, занесеныя ў Чырвоную кнігу. Іх у запаведніку налічваецца каля сотні: 58 відаў птушак, 9 – млекакормячых, 38 – раслін. Цяпер галоўная задача – дабіцца ўключэння Бярэзінскага запаведніка ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены. 15 гадоў таму Бярэзінскі першым сярод запаведнікаў Беларусі быў удастоены спецыяльнага дыплома Еўропы.

Летапіс прыроды, які вядзецца ў запаведніку ўжо 40 гадоў, скрупулёзна фіксуе ўсе змены, якія адбываюцца ў мясцовай флоры і фауне. Сапраўднай скарбніцай інфармацыі з'яўляецца музей прыроды, створаны тут больш за 20 гадоў таму, які ахвотна наведваюць усе, хто бывае ў запаведніку. Панарамы, якія адлюстроўваюць цяжкадаступныя куточкі, чучалы жывёл, галасы птушак, запісаныя на плёнку, робяць незабыўнае ўражанне на дзяцей і дарослых.

Асаблівасцю адпачынку ў Бярэзінскім запаведніку з'яўляецца адсутнасць міжсезоння. Ён аднолькава прыгожы і ў перыяд летняга разнатраўя, калі тут усё цвіце і духмяна пахне, і ў пару залатой восені, і марознай зімой, калі тутэйшыя краявіды нагадваюць казку. Часам, каб трапіць сюды, кліенты браніруюць нумары за месяц. Але павялічваць колькасць гасцінічных нумароў тут пакуль не плануюць. Хаця над развіццём інфраструктуры працуюць пастаянна. У бліжэйшы час, напрыклад, адкрыецца Дом экалагічнай асветы ў Дамжэрыцах, на базе якога плануецца правядзенне канферэнцый і семінараў. Для гэтага тут ёсць усё неабходнае: канферэнц-зала на 200 месцаў, зала на 40 месцаў, бібліятэка, хол для выставак, калекцыйныя залы. Работнікі запаведніка ўпэўнены, што праца, сумешчаная з адпачынкам на ўлонні прыроды, прынясе максімальны эфект. А ў тым, што гэта так, яны штогод упэўніваюцца, прымаючы навукоўцаў, спецыялістаў, турыстаў, якія не першы раз прыязджаюць у запаведнік [2].

**Заключэнне.** Такім чынам, можна зрабіць вывад, што музеі дзейнічаюць у сферы дадатковай, нефармальнай адукацыі. Музеі, як і ўстановы адукацыі, фарміруюць гарманічную асобу з шырокім культурным кругаглядам. Гэта сумяшчэнне інтарэсаў дазваляе наладжваць партнёрства, планаваць агульную дзейнасць.

## Літаратура

1. Гужалоўскі, А. А. Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск, 2001.

2. Цвяткова, Л. Некранутая песня / Л. Цвяткова // Беларусь. – 2007. – № 1.

*Паступіла 30.05.2011*